ческим разбором номеров в связи с соответствием стилю, новизной, грамотным использованием фольклора.

Таким образом, творческая практика является не только базой для апробации знаний, полученных в процессе обучения в вузе, но и возможностью ознакомления с методикой работы в коллективах различных направлений, с различной подготовленностью и возрастными особенностями участников, сравнения особенностей методики различных педагогов танца, репертуаров ансамблей и творческого почерка различных балетмейстеров.

Г.А.Волчак,
выкладчык Беларускага універсітэта культуры

## АСАБЛІВАСЦІ ПСІХАЛАГІЧНАЙ АДАПТАЦЫІ СТУДЭНТАЎ Ў ПЕРЫЯД ПЕДАГАГІЧНАЙ ПРАКТЫКІ

Адаптацыя — гэта прыстасаванне асобы да характару асобасных уздзеянняў ці да змяніўшыхся ўмоў жыцця. Акрамя псіхалагічнай (прыстасаванне чалавека да ўмоў на ўзроўні псіхалагічных працэсаў, уласцівасцей, стану), існуе і сацыяльна-псіхалагічная (прыстасаванне да ўзаемаадносін у новым калектыве) адаптацыя.

Педагагічная практыка — асаблівы від дзейнасці. Адаптацыя студэнтаў у перыяд педагагічнай практыкі залежыць ад многіх фактараў.

1. Агульная і педагагічная падрыхтоўка кожнага студэнта іграе вялікую ролю пры адаптацыі да педагагічнай дзейнасці.

2. Валоданне тэарэтычнымі ведамі, уменнямі, навыкамі, магчымасць прымяняць гэтыя веды на практыцы, выкарыстанне ведаў у непрадбачных прафесійных абставінах таксама маюць вялікае значэнне пры адаптацыі.

3. Крэатыўнасць — творчае ўжыванне ведаў у непрад-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бачных жыццёвых абставінах — адзін з немалаважных фактаў пры праходжанні практыкі.

Добрае валоданне спецыяльнымі ведамі яшчэ не дае гарантыі поспеху на педагагічным полі дзейнасці. Таму перад педпрактыкай у пэўным асяроддзі, выключна ў спецыялізаваных школах (музычных, мастацкіх і г.д.), вялікае ўздзеянне на атрыманне педагагічнай спецыялізацыі аказваюць асобасная ўстаноўка студэнта і станоўчая матывацыя. Калі студэнт валодае ўстаноўкай і станоўчай матывацыяй на набыццё педагагічнага вопыту, тады педпрактыка праходзіць для яго цікава.

Для паспяховага праходжання педпрактыкі неабходна валоданне не толькі агульнымі ведамі, але і методыкамі выкладання ўрокаў і правядзення розных пазаўрочных мерапрыемстваў.

На адаптацыю ў сацыякультурным асяроддзі вялікі ўплыў аказваюць індывідуальныя характаралагічныя асаблівасці кожнага студэнта: тэмперамент, характар.

Валоданне і ўлік студэнтамі ўзроставых нормаў і індывідуальных асаблівасцей дзяцей, з якімі належыць працаваць у перыяд праходжання педпрактыкі, валоданне падыходамі да кожнай узроставай групы іграюць немалаважную ролю.

Як тычыцца, студэнты ідуць на педпрактыку на знаёмую педагагічную базу (музыкальную ці спецыялізаваную мастацкую школу), але ў перыяд практыкі яны вывучаюць праграмы навучання ўжо з іншай мэтай, таму што ім не проста трэба назіраць, але і самім актыўна ўдзельнічаць у педагагічным працэсе.

Спецыфіка педагагічных баз таксама аказвае пэўнае ўздзеянне на адаптацыю студэнтаў. Гэта і індывідуальныя і асабліва сумесныя формы заняткаў дзяцей (напрыклад, харавы клас, танцавальны ансамбль, творчы калектыў і інш.).

Паколькі ў час педпрактыкі кожны студэнт замацаваны за пэўным педагогам, то вялікі ўплыў на педагагічную дзейнасць аказвае і асоба педагога, з якім яны працуюць, яго індывідуальныя якасці: тэмперамент, характар, рытм і тэмп

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

працы, стыль зносін з вучнямі і студэнтамі, ступень задаволенасці сваёй педагагічнай дзейнасцю і інш.

Дзякуючы адаптацыі складвасцца магчымасць паскарэння аптымальнага функцыяніравання асобы ў незвычайных абставінах. Калі адаптацыя не наступае, узнікаюць дадатковыя цяжкасці ў засваенні прадмета дзейнасці, парушэнне яе рэгуляцыі.

Таму можна з упэўненасцю сказаць, што калі адаптацыя ў перыяд педагагічнай практыкі прайшла паспяхова, то ў будучым мы атрымаем дастойнага спецыяліста-педагога сацыякультурнай сферы.

Л.М.Гамеза,
дацэнт Белдзяржуніверсітэта

## РОЛЯ ПЕДАГАГІЧНАЙ ПРАКТЫКІ Ў ПАДРЫХТОЎЦЫ СПЕЦЫЯЛІСТА-ФІЛОЛАГА

У працэсе падрыхтоўкі настаўніка высокай кваліфікацыі вялікае значэнне надаецца педагагічнай практыцы. Практыка з'яўляецца неабходным элементам навуковай арганізацыі вучэбнага працэсу і падрыхтоўкі спецыялістаў высокай кваліфікацыі ў вышэйшай навучальнай установе. Яна служыць сувязным звяном паміж тэарэтычным навучаннем студэнта і яго будучай самастойнай работай у школе, дапаўняе і ўзбагачае тэарэтычную падрыхтоўку студэнтаў, дае магчымасць для замацавання і паглыблення атрыманых ведаў, выкарыстання тэарэтычных палажэнняў. У ходзе педпрактыкі фарміруюцца асноўныя прафесійныя ўменні і навыкі. Будучы настаўнік назірае і аналізуе розныя бакі вучэбна-выхаваўчага працэсу, вучыцца праводзіць урокі розных тыпаў па прадмеце, вядзе пазакласныя і пазашкольныя заняткі, выхаваўчую работу. Пры гэтым ён непасрэдна ўдзельнічае ў рабоце педагагічных саветаў, прадметных метадычных аб'яднанняў, семінараў класных кіраўнікоў. Ён вучыцца будаваць адносі-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ